Cana asobnaha numaru 20 hr. Pierasył

Nr. 42 (587). Wilnia, Niadzieła 18 Listapada 1934 h. Hod X (XVIII).

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i literaturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčynlena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

„Biel. KRYNICA" kaštuje na hod—4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy—1 zał. Zahranicu ŭdwaja daražej. Ceny abwiestak pawodle ŭmowy.

Балтыцкі Саюз і Беларусы

Некалькі месяцаў таму дужа многа пісалася і гаварылася, — а так-жа пішацца і гаворыцца яшчэ й цяпер, — аб Саюзе Балтыцкіх Дзяржаў. У выніку захадаў і стараньняў некаторых палітыкаў зацікаўленых дзяржаў, пачатак балтыцкага Саюзу зроблены. Паўстаў, як ведама, саюз літоўска-латыска-эстонскі.

Галоўны палітычны зьмест гэтага саюзу зводзіцца да наступных пунктаў: супрацоўніцтва ў палітыцы заграцічнай, блізкія ўнутраныя адносіны, вольная рука Літве ў справе Вільні і пажаданьне прыняць у саюз іншыя — бліжэйшыя і далейшыя — балтыцкія дзяржавы.

Гэты апошні пункт паслужыў нам нагодай да пісаньня гэтага артыкулу аб беларускіх адносінах да Балтыцкага Саюзу. Ведама, дзеля сучаснага паднявольнага палажэньня беларускага народу, справа гэта сяньня неактуальная, але не тады-ж сабак карміць, як на паляваньне йсьці. Беларусы мусяць загадзя распрацоўваць сваю палітычную ідэолёгію і ўкладаць пляны на будучыню, калі беларускі народ станецца незалежным гаспадаром на сваей зямлі. Шляхам і вакном на сьвет — апрача мора Чорнага — для нас зьяўляецца Балтык.

Дзеля гэтага сама сабой напрашаецца думка хоць тэорэтычнага покуль што далучэньня Беларусі да Балтыцкага Саюзу. Ды тым, больш павінны мы аб гэтым гаварыць, калі аб гэтым-жа яшчэ пры скончэньні сусьветнай вайны гаварылі нават не беларусы.

6.I.1916 г. у Коўне адбылася нарада літоўцаў і латышоў, якія ўтварылі «Галоўны Літоўскі Народны Камітэт» і абвесьцілі незалежнасьць зямель быўшага Вялікага Княства Літоўскага. Вось пункты гэнага акту абвешчаньня: «1. Літоўцы і латышы, будучы як сваей нацыянальнасьцяй, так і гісторыяй зусім розныя ад народаў славянскіх і германскіх, згодна з думкай самаазначэньня народаў, дабравольна злучыўшыся, твораць незалежную конституцыйную дзяржаву з даўнейшай назовай: Вялікае Княства Літоўскае. Літоўскі народ і латыскі ў гэтай дзяржаве зьяўляюцца аўтаномнымі.

2. Вял. Кн. Літоўскае складаецца з этнографічных літоўска-латыскіх зямель апёртых аб Балтыцкае мора.

3. Дзеля таго, што даўней у склад Вял. Княства Літоўскага ўваходзілі і землі беларускія, дык і беларусы, калі-б прызналі гэта згодным з іх народнымі імкненьнямі, маглі-б таксама далучыцца, як трэцяя аўтаномная складовая часьць.

4. Граніцы гэтых двух — ці эвэнтуальна трох — аўтаномных складовых часьцін Вял. Кн Літ. усталіць супольная камісія, зложаная з прадстаўнікоў іх.

5. Галоўны Літоўскі Народны Камітэт зварочваецца з гэтымі дамаганьнямі да мірных кангрэсаў, якія адбудуцца па скончэньні сусьветнай вайны».

Хутка пасьля абвешчаньня Вял. Кн. Літ. С. Бакайтіс апрацаваў праект конституцыі і распаўсюджваў яго ў Літве.

Аб гэтым аднак праекце фэдэрацыі ці конфэдэрацыі Літвы, Латвіі і Беларусі літоўскія і латвійскія палітыкі хутка забыліся і прыступілі кожны паасобку да здабываньня і будаваньня незалежнасьці свайго народу на падставах сваей нацыянальнасьці. І ня мыляліся, гэтак паступачы, гэныя палітыкі. Так паступаць вучыла і вымагала само жыцьцё. Кожны народ прадусім сам сабе мусіць здабываць незалежнасьць, а пасьля думаць аб розных саюзах і дагаворах з суседзямі. Гэткай дарогай павінен ісьці і народ беларускі, не забываючы пры тым ніколі, што да гэтага ўжо й цяпер трэба рыхтавацца, распрацоўваючы палітычную ідэолёгію і шукаючы шляхоў сужыцьця і дружбы з тымі суседнімі народамі, — асабліва ўчасьнікамі быўшага Вял. Кн. Літ., — супольную падарож з якімі нам вызначыла сама гісторыя.

Шляхам да вызваленьня.

(Да справы абнаўленьня Б Х Д)

Хай і мне пазволеным будзе як старому артаю на беларускай ніве, колькі ўвагаў дакінуць у справе абнаўленьня БХД.

Ня маю на мэце лаіць старыя праўды і новым праўдам пяяць хвалебныя гымны ня зьбіраюся, бо што крыклíва і ў натугах зроджана ў сучасных хворых варунках ня ёсьць яшчэ праўдай, з якой трэ' йсьці ўперад і дзеля яе нішчыць старое.

У палітычнай праграме якой-колечы партыі ня вопратка крыклівая зьмест становіць, а дыктаваныя жыцьцём патрэбы.

Якія вымогі ставіў учора і сёньня ставіць нашым беларускім палітычным партыям кожны сьведамы й чэсны сын нашай Беларусі? — Перш за ўсё, каб гэныя партыі змагаліся дзейна за вызваленьне свайго народу, якое пайсьці павінна побач і ў двох роўналежных кірунках: вызваленьня нацыянальнай душы народу і вызваленьня ягонага матар'яльнага быту ад капіталу. Бо пакуль народ наш ня вызваліцца нацыянальна і Беларускі народ ня станецца самастойнай палітычнай адзінкай, датуль беларускі сярмяжнік будзе пакрыўджаны і ня ўбачыць дабрабыту.

Няма месца і часу, каб спрачацца пра тое, ці слушна пастулаў Торквэмадо, калі гарачым жалезам „навучаў" праўдаў Хрыстовых „няверных", а сёньня такім-жа жалезам „выганяюць" Бога з Расеі. Пэўна-ж усім нам, што праўды Ягоных высокіх вучэньняў не вымагаюць ні гвалтаў, ні зьдзекаў.

Рэлігія, вера — асабістая справа чалавека, ёсьць справай сумленьня. І пэўна-ж, што той, што жыве ў сям'і беларускай і ўважае сябе за чэснага й вернага сына Беларусі, але не нашоўшы ў сабе сілаў і моральнага гарту, каб стацца ў чыне верным праўдам Хрыстовым, тых ушануе, што сілу гэную ўжо здабылі, або яе шукаюць.

Тым, што вышлі з пад саламяных стрэхаў нашых сёлаў і вёсак, — тым, што зжыліся з народам нашым і яго палюбілі сэрцам гарачым і што прывыклі думаць перш-на-перш пра яго нядолю — ня трэ' адрывацца ад працы на зямлі і шукаць у паднябесьсі ідэалаў, цьвердзячы, што гэтага быццам жыцьцё вымагае. Жыцьцё-ж вымагае і нас прынукае да дзейнага чыну, каб народ наш стаў вольным. І гэта не жаданьне адзінак або грамадзкага збору, а выразная воля народу, якую ўжо не аднойчы выяўляў і выяўляе station станоўка сёньня.

На старонках „Бел. Крыніцы" кінута думка пра форму корпоратызму, як аб „найлепшай" форме грамадзкага ладу. Чаму корпоратызм, які йшчэ блізу нічога не сказаў пра сябе сьвету, найляпей адказваў-бы патрэбам беларускага народу, аўтары думкі бадай не праканалі нікога, а я-ж бяру на сябе сьмеласьць цьвердзіць, што й не праканаюць. Бо думка аб корпоратызме зрадзілася не сярод нас і вырасла не з патрэбаў нашага народу. Дык якая патрэба захваляць „тавар" чужы нам і няпэўны?

Ці форма корпоратызму была-б лепшай за лад дэмократычны, які многія прывыклі ўважаць за найболей адказны для нашай структуры, ці мо' што іншае яшчэ было-б лепшае, спрачацца ня варта, бо няма цяпер у гэтым патрэбы: асьмяшацца лёгка, а карысьці ніякай.

Трэ' тут сказаць праўду, што маем благую прывычку на другіх аглядацца, паддавацца неразважным падшэптам і таптацца на месцы, а пасьля, ставячы абстрактныя прынцыпы вышэй за рэальную справу, доўга спрачацца, калі часам няма патрэбы гэным „прынцыпам" удзяляць і добрага слова.

Але зусім ужо блага, калі разважаюць, ды яшчэ быццам паважна, тыя, што рэжуць ужо з месца і без агляды, што прыватная уласнасьць — гэта ніякая сьвятасьць.

Калі пойдзема не за патрэбамі нашага працоўнага селяніна, а за імкненьнямі, што вырасьлі з сучаснага хаосу і хворых думак „тварцоў" новых формаў ладу, тагды, пэўна ж, што прыватная ўласнасьць нашага сялянства, здабытая потам і часта крывёй ягонай і ягоных дзядоў, не зьяўляецца нейкаю ненарушымаю сьвятасьцю і яе можна нарушыць, аддаўшы пад нагляд грамадзкі, проста селяніна загнаўшы ў прыгон.

„Пример заразителен" — скажуць валадары з усходу — і слушна. Бо калі ў іх там абстрактны прынцып, стаўшы вышэй жыцьцёвых патрэбаў сялянства, давёў гэнае сялянства да згубы, дык ці-ж няпрыемна ўладаром Расеі пачуць, што і ў Зах. Беларусі ўжо падгатаўляюць на мужыка згубу. І калі? Тады, як гэны мужык, аручы свой загон, мае хоць тую адную ўцеху, што свой шнур паліваe потам, свой шнур перадасьць сваім дзеткам.

БХД чэсна прайшла шмат гадоў працы і змаганьня і сёньня трывалка і чэсна трымае бел.-чырвона-белы сьцяг вызваленьня. Заслуг прад народам ужо мае многа.

POLONIZACYJA PALEŚSIA.

Paleśsie zasielena z adnaho boku biełarusami, a z druhoha ŭkraincami. Dziela taho, što tam słabaja nacyjanalnaja świedamaść i značna nižejšaja kultura naahuł u paraŭnańni z centralnymi biełaruskimi i ŭkrainskimi asieliščami, polskija kruhi palašukoŭ, asabliwa našych, biełaruskich, uważajuć za asobnuju etnohrafičnuju masu i starajucca jaje apalščyć.

Ab hetym polskaja časopiś „Bunt Młodych," orhan maładoj polskaj intelihiencyi, u numary 16 s. h. miž inšym piša hetak:

...„U nieskrystalizawanuju i ŭściaž płynnuju masu z hledzišča palityčnaha, etničnaha, a taksama i relihijnaha, pačali ŭłazić roznarodnyja nawinki, kirunki i ruchi...

Aktyŭnaść paleskaj palityki musiła abciorcisia i ab prablemu relihijnuju, wyraźniej relihijna-palityčnuju.

U škołach dasiul relihija wykładałasia prawasłaŭnymi papami parasiejsku...

Wajawoda Biernacki stanuŭ na stanowiščy takim, kab prawasłaŭnaj relihii nawučali papolsku.

Niama ciapier taho na Paleśsi, kab za sławami nia jšło dzieła. Zaraz-ža byli wydany adpawiednyja zahady. Padobna tolki ŭ 30 proc wypadkach spatkaŭsia heny zahad z silniejšaj abo słabiejšaj apazycyjaj z boku papoŭ. Masy, jak zaŭsiody, inertnyja. Wučycielstwa było zdawolena, bo heta była wada na ich młyn. Usio polskaje hramadzianstwa muram stanuła za hetkuju palityku wajawody Kostek - Biernackaha..."

Woś jak ilustruje „B. M." polonizacyjnuju akcyju na Paleśsi. Z hetaha my bačym, što tam idzie baraćba miž palakami i maskalami za dušu biełaruskich i ŭkrainskich palašukoŭ. Maskali apanawaŭšy prawasłaŭnuju carkwu, pad naciskam wajawody Kostek-Biernackaha, z škoły ŭstupajuć, zatrymliwajučy swaje ŭpływy ŭ carkwie. A polski nacyjanalizm natužwajecca praz škołu apanawać i carkwu.

Nam, biełarusam, „karyść" z hetaha adnolkawaja, jak z maskoŭščyny tak i z polščyny. My musim na biełaruskim Paleśsi ŭzbudzić biełaruskuju narodnuju świedamaść. Heta našaje zadańnie času, hetaha wymahaje ad nas historyja.

P.

Яшчэ і да абнаўленьня не адгараджвалася мурам у працы ад тых людзей добрай волі, якія не маглі дзеля перашкодаў праграмнага характару ў ейных радох працэваці, і гасьцінна свае ім дзьверы адкрывала.

Ня бачу патрэбы, каб БХД даконвала зьменаў вялікіх у сваей праграме. Як на галоўнае, хачу тут зьвярнуць увагу, іменна на тое, каб у праграму жыцьцё было ўліта і патрэбы нашага народу яе харашылі, а ня пункты і догмы пустыя, што повадам часта служаць да звадак і тамуюць плодную працу.

Аб назове яшчэ пару слоў сказаць засталося. Ворагі я крыклівых назоваў і ўважаю, што назоў: „Лучнасьць Вызваленьня Беларускага Народу" адказвае таму прызначэньню, у імя якога ўсе верныя сыны нашай многапакутнай Беларусі мусяць лучыцца.

Антон Паддубіч.

„Когда-бы вверх могла поднять ты рыло"...

„Białorusini Polacy" з „Роднага Краю"(№24) затрывожыліся. Затрывожыла іх справа абнаўленьня БХД. Пасьвяцілі яны ёй, хоць бязглузды, але ўступны артыкул. Пены, сьліны, ненавісьці да нас поўна ў ім. Дыня даў Бог сьвіні рог. Няма чым калоць. Уся напасьць зводзіцца вось да чаго: БХД— гэта каталікі, яны ўцягваюць і праваслаўных, але тыя да іх ня йдуць, бо — бачыце — псыхіка каталікоў і праваслаўных— гэта два дыямэтральныя полюсы; БХД „моўчкі" падтрымлівае унію; БХД пераменяецца, бо рыхтуецца да выбараў, але ўсё гэта нічога не паможа, бо яна заўсёды астанецца каталіцкай...

На гэта ўсё бязглузьдзе, робячы бел.-польскай угодзе чэсьць, адказваем: БХД — арганізацыя агульна-беларуская, дык сапраўды ёсьць у нас і каталікі, але ёсьць і праваслаўныя, нават у прэзыдыі ЦК два віцэ-старшыні праваслаўныя, не гаворачы ўжо аб звычайных сяброх нашых. Аб нашых-жа ўплывах на народ наш судзіць не бел.-палякам, а няхай нас судзіць тая беларуская праца, якую мы зрабілі і якую робім далей і няхай нас урэшце судзіць той-жа народ беларускі.

Мы — кажуць санатары — „моўчкі" уніі спрыяем. Вось-жа мы ня „моўчкі" спрыяем уніі, але яўна аб ёй кажам, што сяньня ў Польшчы праводзіцца унія польскімі рукамі і для польскіх мэтаў і прад такой уніяй мы заўсёды народ свой прасьцерагалі і прасьцерагаем.

Мы зьмяняемся ня дзеля выбараў і ня дзеля якіх іншых штук, як зьмяняюцца бел. санатары, калі носам пачуюць інтэрас, але дзеля таго, каб аднавіцца, больш датасавацца да сучасных варункаў, каб больш карысна працаваць для бел. народу. Аб выбарах-жа покуль-што ня скажам нічога, бо ня хочам, каб бел. санатары так лёгка на нас зарабілі.

Хлусьлівае так-жа і прароцтва бел.-палякаў аб тым, што БХД і па абнаўленьні астанецца толькі каталіцкай, бо як да абнаўленьня былі мы арганізацыяй агульна-беларускай, такой будзем і па абнаўленьні. Мы ведаем, што бел. палякі маюць за заданьне паглыбляць розьніцу між беларусамі каталікамі і праваслаўнымі, каб іх хлебадаўцы лягчэй маглі праглынуць адных і другіх, але мы да гэтай юдавай справы рукі сваей ня прыложым і конкурэнцыі ў іх заработках ня зробім, бо нашай заўсёднай прынцыповай мэтай ёсьць нацыянальная еднасьць беларускага народу.

Радзім урэшце бел. палякам хоць крышку мець для нас сэрца, прынамсі за тое, што іх трымаюць сільныя гэтага сьвету іменна, каб яны нас кусалі, разьбівалі беларускае жыцьцё і за гэта зараблялі. Бо на што-ж былі-б бел. санатары патрэбны, каб нас ня было?

Прыпомнім ім байку Крылова аб няўдзячнай сьвіні, што нажоршыся жалудоў пачала рыць і рваць карэньні дуба, а які ёй на гэта сказаў: „неблагодарная, когда-бы вверх могла поднять ты рыло, тебе-бы видно было, что эти жолуди на мне растут"... Бел. санатары пабіраюць смачныя „жалуды" якраз затым, што мы існуем і праводзім беларускую работу. Дык хоць крышку для нас удзячнасьці!... *mb.*

Biełaruskija

Kalendary

— adryŭnyja i knižkaj —

na 1935 hod

možna najwyhadniej kupiać u

BIEŁARUSKAJ KNIHARNI «PAHONIA» Wilnia Zawalnaja 1.

Cana adryŭnoha kalendara 55 hrašoŭ.

Cana kalendara knižki 65 hr.

Pry bolšych zakupach wialikaja ŭstupka. Biaz hrošaj kalendary nie wysyłajucca. Pierasyłka adnaho kalendara 25 hr. na košt zakazčyka.

Bibliotečnaja sprawa ŭ B.S.S.R.

Jak užo wiedama całamu świetu, balšawiki wielmi lubiać chwalicca nawat tym, čaho nia majuć: prytočywajuć u roznych statystykach, časta nieisnujučyja, cyfry swajho wialikaha socyjalistyčnaha dasiahnieńnia. Časta duža šyraka raspisywajucca ab wykananych planach, jakija paśla akazywajucca nieraspačatymi. Časta padajuć na ilustracyjach ahramadnyja bloki nowaha budaŭnictwa žalezna-betonowaha, cehlanaha i dzierawianaha, całyja kwartały, całyja haradki i h.d., jak užo pabudawanyja. A jak paśla akažycca, — byli heta tolki źnimki fotohrafičnyja prajektaŭ, jakija niawiedama, ci buduć kali realizawany. Hetakija „zdabytki" Okciabrskaj Rewalucyi časta my spatykali ŭ „Źwiaździe", „Čyrwonaj Biełarusi" i inš., jak „ahramadny" budynak baletu i opery ŭ Miensku, cały kwartał budynkaŭ pawodle apošnich wymohaŭ techniki praznačany pad Biełaruskuju Akademiju Nawuk, dom piśmieńnikaŭ i t.p. Ale, jak akazałasia, usie hetyja damy jašče i siańnia znachodziacca ŭ prajekcie.

Ciapier waročajučysia da našaj temy, musim skazać, što i ŭ halinie bibliotečnaj sprawy ŭ 90 proc. tak nia jość, jak padajuć aficyjalnyja dadzienyja Narkomaświety. Jak my wiedajem, u BSSR, jak i ahułam u całym Sajuzie Sawieckich Respublik, wielmi mnoha jość roznych kulturna-praświetnych i tawaryskich ustanowaŭ, ale heta ŭžo ŭ wialikaj bolšaści źjaŭlajecca tolki na papiery.

Kali woźmiem ciapier biblioteki, jakich jość masa zarehistrawanych u Narkomaświety, dyk u 50 proc. hetyja biblioteki-čytalni i narodnyja damy i kluby nia majuć knižak, aprača prymusowaj litaratury, jakuju masawa i biaspłodna ŭsiudy raskidajuć.

Jašče bolš trahična budzie sprawa bibliotečnaja pradstaŭlacca z punktu hledžańnia biełaruskaha, kali pabačym, što i ŭ tych bibliotekach, asabliwa na siale, u jakich i jość pa paru dziesiatkaŭ knižak, to amal budzie poŭnaja adsutnaść biełaruskich knižak. Znojdziem tam Puškina, Lermontawa, a wielmi časta i čysta čarnasociennych aŭtoraŭ historyi, hieohrafii i t. p., dy nowyja wydawiectwy u rasiejskaj mowie, jak „Отчеты с'ездов," „Пятилетния планы," „Политграмоту" — Інгулова. „Блок пол. агитатора в деревне," „Спутник коммуниста в деревне" i t. p. Woś bolš mienš hetakaha charaktaru znachodzicca litaratura ŭ bibliotekach na siale BSSR. Dziwicca z hetaha sumnaha źiawišča nia treba, bo skul-ža woźmuć biełaruskuju litaraturu, abo čužuju ŭ biełaruskaj mowie? Amal usie wydawiectwy, jakija wydadzieny byli ad 1922—1930h., h. zn. za časoŭ „Nacdemaŭščyny," — padpali dziaržaŭnaj kanfiskacie i zabaronie dla publičnaha karystańnia.

Klasyčnyja twory Kołasa, Kupały, Biaduli, Zareckaha, Duboŭki, Dudara i inš. wydatnych paetaŭ i piśmieńnikaŭ akazalisia zabaronienaj litaraturaj, a wiernyja słuhi Čyrwonaha Kramla, rožnyja Aleksandrowičy, Klimkowičy, Izi Charyki, Chaimy Duncy, Branštejny i inšyja Winawery nia majuć času twaryć biełaruskuju litaraturu, bo jany zaniaty „wykarčowywańniem reštak nacdemaŭščyny" na Biełarusi. Nu što-ž, jak niama litaratury biełaruskaj, to chaj budzie ŭ bibliotekach rasiejskaja, žydoŭskaja, polskaja i t. p. Dla „internacyjanalnaj sprawy" značeńnia nia maje niejkaja tam biełaruskaja mowa. Heta taksama pamahaje „wykarčowywańniu nacdemaŭščyny, hłumleńniu biełaruskaj nacyi, i hetakim sposabam dachodzicca da akančalnaj mety, kab „все ручьи слились в русском море."

Bibliotekary z wialikim naciskam padčyrkiwajuć u sprawazdačach bibliotečnych, što ŭ ich znachodzicca nadzwyčajny mastacki twor Janki Kupały—poema „Nad rakoju nad Aresaj." Sapraŭdy heta „mastacki twor" najwialikšaha našaha paety, wydušany ad 1930—33 hodu na 12 staronak druku, dzie poet u formie wieršawanaj daje prozaičnaje, nudnaje apisańnie paŭstałaj kamuny ŭ Paleskich bałotach. I woś heta uwieś „pradukt" Kupały za 4 hady ŭ „adrestaŭrawanaj" Biełarusi, dadaŭšy jašče niekulki panegirykaŭ na źjezdy Sawietaŭ i „Čeluskincam."

A ciapier hlaniem, što pišuć sami balšawiki ab bibliotečnaj sprawie na Biełarusi.

„Litaratura RSFSR, Ukrainy i inšych brackich respublik raspaŭsiudžwajecca ŭ wialikaj kolkaści, kab zadawolić roznastajny popyt na knihu.." („Bolšewik Biełarusi" Nr17-18, 1934 h).

Dalej chwalicca aŭtor, skolki na BSSR. jość bibliotek: „K pačatku 1934 h. u Biełarusi naličwałasia 1.444 chaty-čytalni, 773 masawyja biblioteki, dziesiatki bibliotek WNU i nawukowych ustanoŭ. U bibliotekach Biełarusi skoncentrawana kala 4,5 miljon. tomaŭ. Adnoj tolki siećciu masawych bibliotek sistemy ANA i profsajuzaŭ absłuhowywajecca 270—300 tysiač čytačoŭ."

Adnak dalej piša aŭtor: „Bibliotečnaja sprawa ŭ BSSR pastaŭlena ŭsio ž niezdawalniajuča. U rašeńni CKK P(b)B. ad 16 VIII.1933 h. ukazana, što Narkomaświety ŭ kiraŭnictwie bibliotečnaj sprawaj dapuściŭ paŭniejšy samaciok. U biblioteki praleźli kłasawa-warožyja proletaryjatu ludzi, jakim

---

Wincuk Adwažny. 21)

Chłapiec.

POWIEŚĆ.

* * *

I. Familijnaja Rada.

Naš chłapiec, Wincuk Paŭłowič, majučy dwa naccać hadoŭ, skončyŭ pačatkawuju školu. Apošni ekzamin udaŭsia dobra, nawiet i wielmi dobra. Ale Wincuk nia wyjšaŭ pieršym wučniem, jak cichańka ab hetym nadzieiŭsia. Usio dzieła papsuła arytmetyka, za katoruju Wincuś dastaŭ tolki čaćwiorku.

Woś chłapiec z pachwałaj pakidaŭ školu i wychodziŭ na Božy świet.

Ale što rabić dalej? Darohaŭ było mnoha, ale ŭsie wuskija i ciesnyja.

Dumała, hadała Hanula, što rabić dalej i kudy pakirawać chłapca i nie mahła, jak kažuć, dumki pryłažyć. Treba było sklikać Familijnuju Radu!

Sabrałasia Rada. Naležyli da jaje: ciotka Maryla, dziadźka Tamaš, brat Hanulin Symon, stary dziadźka Aleksandra Matusewič, i jašče, choć nie z radni, ale pa znajomaści, — Kajetan Jurewič, nu i sama Hanula. Tolki nie naležyŭ da Rady najbolš joj zainterasawany — sam Wincuś. Jaho puścili hulać. Jon i nie dahadaŭsia, što tut buduć rastryhać jahony los.

— Što mnie rabić z chłapcom? — pytałasia Hanula. Woś jakraz skončyŭ škołku. Što dalej? I kudy jaho pakirawać? Baćka daŭno pamior, a ja adna bajusia rasparadžacca jahonaj dolaj. Chłapiec-sirata, a ja — ŭdawa.

Usie zadumalisia. Kožny pačuwaŭ na siabie biarema adkaznaści za čužy los.

— Wy ciapier hawarycie! — adazwaŭsia pieršy dziadźka Matusewič, — bo kaliści Hanula mianie nie pasłuchała, dyk ja nie chaču pieršy radzić. Što z takoj rady, kali ciabie pytajucca, a pośle robiać paswojmu?

—Što-ž!—adazwałasia Maryla. Ja dumaju, siastryca, addaj ty jaho da stalara. Wot Kajetan jakraz tut, a jon dobry stalar i Boh jamu pamahaje. Paprasi, kab syna pryniaŭ na nawuku, — i kusok chleba mieć budzieš.

— A moža lepš da kawala? — skazaŭ niaśmieła Tamaš, kab jaŭna nie piarečyć žoncy.

— Kawalom nawiet lepš być, — dabawiŭ Symon, — bo i baćka Wincusioŭ byŭ kawalom i dobra žyŭ. — I... skora pamior, — dabawiŭ Kajetan Jurewič.

— Nia ŭsie-ž kawali tak skora pamirajuć, — skazaŭ dziadźka Aleksandra, pykajučy lulku.—Wun Icka kawal maje ŭžo kapu hadoŭ.

— Hawarycie wy tut, jak sabie chočycie, — skazaŭ pawažna Kajetan Jurewič, — a ja wam skažu, što wiedaju. Pamojmu Wincuś ani na stalara, ani na kawala niazdatny. Druhoje dzieła — moj chłapiec, Kastuś: čyrwony, zdarowy, plačysty—jamu tolki z siakieraj, z piłoj, heblem i pracawać! Ja nia dziela taho, kab Wincusia da siabie nia pryniać, ale dziela taho, što dzicia bledaje, chudoje, małoje,... kudy jamu ciahać ciažkija belki, ci bić małatam pa kawadle. Upadzie ŭ suchoty i pamre ŭ maładych hadoch, jak i baćka jahony. Tut sprawa jasnaja. Jak na dałani.

— Dyk addaj, Hanula, chłapca ŭ šaŭcy ci kraŭcy! — radziła dalš Maryla. Heta rabota hulaščaja. I zarobić dobra i zdaroŭja nia stracić, i sama budzieš rada.

— Ja ŭžo daŭno joj ab hetym kazaŭ, ale tahdy nie pasłuchała mianie, — skazaŭ dziadźka Matusewič.

— Što-ž, nie pasłuchała, — adkazała Hanula. — A woś chłapiec skončyŭ škołku i..

— Nu, i što? — pierabiŭ dziadźka.

— Jano to niby ničoha, — kazała Hanula,— ale ŭsiožtyki chłapiec budzie razumniejšy. I dobra wučyŭsia.

Dziadźka machnuŭ rukoj i ničoha nie skazaŭ, tolki burknuŭ sam sabie: „Knižnaja mudraść—sabakam na padnoski!"

Ja ŭžo prabawała kazać jamu, — hawaryła Hanula, — ale chłapiec ab šaŭcoch i słuchać nia choča! Płača bieskaniečna, kab addać jaho ŭ školu — „Haradzkoje wučylišča" ŭ Nowaj Murawancy. I sama nia wiedaju, adkul heta jamu pryšło ŭ haławu i hdzie jon dawiedaŭsia, bo jakraz ciapier nichto z całaj Zawałaki tam nia wučycca.

— Ničoha. Papłača i pierastanie. A pośle prywyknie i budzie dobrym šaŭcom, — kazaŭ Tamaš Piatrowič.

— Jak majstar pociaham pieraciahnie kolki razoŭ, dyk i płakać pierastanie, — ćwiardziŭ swajo dziadźka Matusewič.

— Pačakajcie, susiedzi! — kazaŭ Kajetan Jurewič, — nia ŭsio možna ŭ dzicia ŭbić. Jak dzicia nia maje da čaho skłonnaści, dyk choć zarež jaho, — ničoha z im nia zrobiš! Tak i ŭ źwiaroŭ bywaje: choć kata zabi, jon za zajcam nie pahonicca, a sabaku — dyk i strymać nia možna. Woś, prymierna, moj Kastuś: wiečna z ražnami i z heblem wozicca, — usie palcy parezaŭ, — značyć, budzie dobry stalar. Moža nawiet budzie lepšy za mianie, bo skončyŭ tutejšuju škołku.

— A na što stalaru nawuka? — pytaŭsia

RWK i horsowiety daručyli bibliotečnuju sprawu. Pad wyhladam ačystki bibliotek ad kłasawa-warožaj proletarjatu litaratury hetyja ludzi *zdawali u makulaturu twory kłasikaŭ marksizma-leninizma.*" (Padkr. A. Paddubny).

Widać, jakaja musiła być „čystka," kali tak sumlenna wykonwali „prykaz!" A chto tam wiedaje, ci Marks z Leninam nia byli worahami proletaryjatu, dyk na ŭsiaki wypadak i ich won! Cikawa, što možna było pakidać u bibliotecy. —Chiba tolki pramowy Stalina, Haładzieda i Hikały! Sapraŭdy musić być „bahaty" knihazbor henych bibliotek!

Dalej čytajem: „Biblioteki ŭsio jašče niezdawalniajuča wykonywajuć swaju zadaču prapahandy komunizmu, dawiadzieńnia da mas čarhowych zadač i łozunhaŭ partyi."

Jak bačym, sawieckija biblioteki musiać wykonywać takuju rolu, jakuju ŭ nas wykonywajuć sołtysy — „dawiadzieńnia da mas čarhowych zadač i łozunhaŭ partyi."Pieknaja rola, niama što kazać, možna pazajzdrościć!

I sapraŭdy, što možna znajści ŭ bibliotecy, kali u „rajonnych bibliotekach Drysienskaha, Buda Kašaleŭskaha, Łahojskaha i inš. rajonaŭ nia było poŭnaha zboru tworaŭ Lenina, Marksa, Engelsa, Stalina i inšaj aktualnaj litaratury!Persanalnaja absłuha bibliotek pastaŭlena nižej krytyki. Pierawažnaja bolšaść zahadčykaŭ i bibliotekaroŭ — heta ludzi niekwalifikawanyja, a časta nawat małapiśmiennyja. Nowyja kadry bibliotekaroŭ majuć słabuju jak ahulna-palityčnuju, tak i specyjalnuju padrychtoŭku: 60 proc. z nižejšaj aświetaj i tolki 12 sa specyjalnaj... Knižnyja fondy mnohich bibliotek raskradalisia, „začytwalisia."

„U bibliotecy fabryki „Герой працы" (Homiel) z 20-25 tys. tomaŭ zastałosia tolki 6 tys. Padobnyja fakty adznačany ŭ mienskim kłubie budaŭnikoŭ, u Zasłaŭi, Pietrykawie i inšych rajonach."

Widziačy takoje zajadłaje „čytańnie knižak" CWK SSRR pastanowaj z dn. 27.III.1934 h. starajecca spynić usie „złačynstwy" na froncie bibliotečnaj sprawy; starajecca urehulawać uspomnienuju sprawu. Hetaja pastanowa chutka znajšła wodhałas i ŭ BSSR.: „Mienski bibliotečny kolektar kompletuje 292 biblioteki ŭ 51 rajonie, adnak usio heta tolki pieršyja kroki pa šlachu realizacyi pastanowy CWK SSSR ad 27.III.1934 h."

Sprawa dziciačaj litaratury na Biełarusi jašče horš pastaŭlena. Litaratury na biełaruskaj mowie wykazywajecca poŭnaja adsutnaść. Jość z pasiarod bieł. piśmieńnikaŭ adzin, jaki pracuje nad dziciačaj litaraturaj — heta J. Maŭr, dy j toj biare temy z niehraŭ, eskimosaŭ i t.p. U artykule z „Bolšewika" čytajem: „U Biełarusi naličwajecca 6 dziciačych samastojnych bibliotečak. Pry 84 bibliotekach jość dziciačyja addzialeńni. Sotni škoł majuć bibliotečny fond u 900 tys. tomaŭ. Adnak wialikaja kolkaść dziaciej nie čytaje ŭ bibliotekach z-za adsutnaści ŭ ich „cikawych knih" i z pryčyny ich słabaj raboty. Dzieci wymušany brać knihi ŭ tawaryšoŭ i čytać, jak heta pakazali matarjały abśledawańnia ŭ mienskich školach, twory Čarskaj, Šarłoka, Chołmsa, Nat-Pinkertona i inš.

Wielmi pakazalna, što školniki mała wiedajuć takich piśmieńnikaŭ, jak Gajder, Paŭstoŭski, Bezbarodaŭ, Kažeŭnikaŭ..."

Jak bačym, z prapanawanych aŭtoraŭ niama niwodnaha biełaruskaha piśmieńnika, a pry tym treba skazać, što hetyja aŭtory ŭ rasiejskaj mowie.

Dalej aŭtor prapanuje intensyŭna prawodzić nacpolityku na Biełarusi, praz zakładańnie nacmienšaściowych školaŭ bibliotek, chataŭ-čytalniaŭ i h.d. Jon biaduje, što ŭ BSSR mała jość bibliotek nacmienšaściowych i prytačwaje skolki: „U BSSR — 7 jaŭrejskich bibliotek, 4 polskija, 1 łatyšskaja, 53 polskija chaty-čytalni, 21 jaŭrejskaja, 2 litoŭskija, 2 niamieckija, 4 ukrainskija i 5 inš." (chiba jašče kirhizskija? Pryp. L. P.).

Maŭčyć tut aŭtor ab rasiejskich bibliotekach, bo paswajmu jazykowamu charaktaru pierawažnaja bolšaść bibliotek BSSR jość rasiejskimi. Ab raspaŭsiudžwańni litaratury ŭ biełaruskaj mowie aŭtor ničoha nia piša.

Lawon Paddubny.

Statystyka II dziaržaŭnaj pierapisi na bieł. ziemlach.

Užo my padali statystyku II dziaržaŭnaj pierapisi nasielnictwa ŭ našym Kraju — pawietaŭ: Maładečanskaha, Ašmianskaha, Brasłaŭskaha, Pastaŭskaha, Wialejskaha i Świancianskaha. Ciapier padajom statystyku Wil.-Trockaha pawietu.

U Wilenska-Trockim pawiecie:

U haradoch ludziej ahułam—9542, katalikoŭ 7862, prawasłaŭnych—369; baćkaŭskaja mowa: 8179 polskaja (?), 29 biełaruskaja, 230 rasiejskaja, 7 litoŭskaja, 850 žydoŭskaja, 243 inš.

U wioskach ludziej ahułam — 204 930, katalikoŭ 193.191, prawasłaŭnych 2496; baćkaŭskaja mowa: 172.367 polskaja(?), 5.520 biełaruskaja, 3484 rasiejskaja, 16.928 litoŭskaja, 5 658 žydoŭskaja, 391 inš.

Z hetaha widać, što ŭ Wil.-Trockim pawiecie bolšaść palakoŭ. Ale heta tolki ŭ polskaj statystycy.

Адозва Камісіі Помачы Беларускай Студэнскай Моладзі.

БЕЛАРУСЫ!

Народ без інтэлігенцыі, — як сьвет бяз сонца. Беларускі народ ў пару свайго адраджэнска-вызвольнага руху інтэлігенцыі найбольш патрабуе.

Беларуская студэнская моладзь — гэта-ж частка інтэлігенцыі, якая на высокіх школах здабывае сьвятло навукі. Яна цяпер пераважна знаходзіцца ў жудасна-паганых матэр'яльных варунках. Дзеля гэтага трэба аблягчыць ейнае матэр'яльнае палажэньне, трэба ёй прыйсьці з матэр'яльнаю дапамогаю.

Дапамога беларускаму студэнству ёсьць адной з балючых і жыцьцёвых патрэб беларускага народу, — зьяўляецца адной з пякучых а як-жа важных спраў у інтарэсе гэтага народу.

Беларускае студэнства — гэта маладыя гарачыя сілы, выйшаўшыя перадусім з пад сялянскіх стрэх раскіданых беларускіх вёсак. Шмат мае яно сьвятых пачуцьцяў, шмат думак, імкненьняў, ідэалаў. Яно хоча вучыць і выхоўваць родны народ, служыць ягоным патрэбам, злучыцца з ім духова.

Вызваленча-адраджэнскі рух папхнём значна ўперад, калі створым і павялічым кадры студэнскай моладзі.

А створым і павялічым гэныя кадры тады, калі супольным высілкам і ахвярнасьцю збудуем студэнскай моладзі магчымыя падставы матэр'яльнае эгзыстэнцыі.

На віленскім унівэрсытэце — ведама нам — шмат студэнтаў Беларусаў у мінулых гадох з прычыны кепскіх матэр'яльных варункаў не магло ўтрымацца і апынулася на вёсцы. А шмат ёсьць і сёлета такіх, якіх гэныя-ж варункі змушаюць унівэрсытэт пакінуць.

Ведама так-жа, што многія матурысты, з браку матэр'яльных сродкаў ня могучы вучыцца на ўнівэрсытэце, аддаўна мадзеюць на вёсцы, чакаючы лепшых часоў.

Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вільні, сьведамы гэткага палажэньня і лёсу беларускае студэнскае моладзі, а так-жа сьведамы сваіх нацыянальных і соцыяльных абавязкаў, — на сваім сходзе дня 28.X с. г. сарганізаваў Камісію Помачы Беларускай Студэнскай Моладзі. І мы — Камісія П.Б.С.М. — зварочваемся да Вас, Грамадзяне Беларусы, з гарачым заклікам: **дапамажэце, хто чым можа, — дапамажэце грашмі і натурай беларускаму незаможнаму студэнству**. Не пазвольце душой і целам змадзець нашай студэнскай моладзі. Не пазвольце блукацца ёй дзеля шуканьня хлеба па чужых, часта варожых завулках. Зьбірайце ў грашах і ў натуры складкі, аднаразовыя і сталыя, на справу дапамогі студэнскай моладзі. Прысылайце — прывозьце іх да нас — у Камісію П.Б.С.М. — дзеля падзелу сярод патрабуючых помачы студэнтаў.

Няхай ня будзе Вам, Грамадзяне Беларусы, перашкодаю ў гэтай справе цяжкі перажываны Вамі крызыс. Ведайце, што дзейнасьць Камісіі П.Б.С.М. цалком узалежнена ад Вашай, Грамадзяне, ахвярнасьці, ад Вашай добрай волі.

Пры сарганізаванай помачы, пры агульна-беларускім зразуменьні абавязкаў і істотных патрэб беларускага народу, пры добрай волі ўсіх Беларусаў, — Беларусы, нам здаецца, змогуць забясьпечыць мінімум матэр'яльнае эгзыстэнцыі беларускай незаможнай студэнскай моладзі, аблягчаючы гэтым ейнае матэр'яльнае палажэньне, ствараючы і павялічваючы гэтым так патрэбныя кадры беларускае інтэлігенцыі.

Дык усе, дружна, як адзін, вазьмемся за справу дапамогі нашаму студэнству, нашай маладой інтэлігенцыі, нашай зьмене, — будучын і сіле народу!

ЗА КАМІСІЮ ПОМАЧЫ БЕЛАРУСКАЙ СТУДЭНСКАЙ МОЛАДЗІ

Інж. арх. Л. ДУБЕЙКАЎСКІ — Старшыня

Міф. права Я. ШУТОВІЧ — Сэкрэтар

Вільня, 10.XI.1934.
Адрас Камісіі П.Б.С.М.: Вільня, Завальная 1–3.

---

dziadźka Matusewič. — Možna dołatam dziaŭbać i biaz škoły.

— Biez nawuki budzieš „dzioŭbałam," a nia majstram, — kazaŭ Kajetan. Naša staraświeččyna nie pryznawała nawuki, zatoje i ja tak z nawukaj zapaźniŭsia. Ale ciapier, jak staŭ wučycca moj Kastuś, dyk zacikawiŭsia i ja. Bo i ŭ majej stalarcy patrebna miera, ličeńnie, plan i wykanańnie. Adnym słowam — patrebna nawuka. Ech, bratki wy maje! Ja widžu jasna: kab ja byŭ wučony, jaby pajšoŭ wyšej ad druhich inžynieraŭ, što ciapier dziaruć nos pierada mnoju i tykajuć mnie palcam pad nos: „Tut toje tak — tut toje nia tak!" Ja i ciapier časta spračajusia z imi pry budoŭli. A jak budawali toj niaščasny most u Haradźcy, na Wałačancy, dyk ja doŭha spračaŭsia z tym aŭstryjackim inžynieram i z samym dochtaram. Ja im dakazywaŭ, što treba pastawić pierad mastom dwa ledarezy i samy most raździalić na dźwie asnaŭnyja čaści, a ŭ kožnaj zrabić dwajnuju zastaŭku na šrubach. Prytym siaredzinu masta ŭmacawać žaleznymi abručami. A toj inžynier-čech, dakazywaŭ swajo na rysunkach, a na papierach ja byŭ ślapy. I woś zrabili jany paswojmu, — i pajechaŭ pan dochtar z tym samym mastom, jak-to kažuć „da Abrahama na piwa." Ciapier-ža ŭdawa Pstrykunicha, z swaim hałoŭnym akanomam (i jon čech!), kličuć mianie na hałoŭnaha machanika. Ale ja staŭlu ćwiordyja warunki i, — kab ja tak zdaroŭ byŭ! — lepš zrablu ad taho zahraničnaha inžyniera. — Aha! Ale woś moj Kastuś staŭ śmiajacca z mianie, što ja nia ŭmieju pamnožyć i padzialić nijakich ličbaŭ, i nie mahu tak, jak jon, ławić z pamiaci tablicy mnažeńnia. Nie dačakańnie twajo, kažu, moj ty synok! Nie takaja-ž tut wialikaja mudraść. I woś ja try wiečary, pad sakretam ad chatnich, wučyŭsia hetu tablicu: tahdy pajšoŭ da Kastusia na ekzamin. I... zrezaŭsia saŭsim! Mnie tak było stydna pierad synam, jak-by chto mianie rezaŭ pa horle ščarbataj brytwaj. A Kastuś, — chitry i jazyčliwy, — kaža, nibyto žalejučy mianie: „Tata ŭžo stary, dyk zatoje i trudna. Treba było maładomu wučycca."— A jaki ja stary? Mnie tolki tryccać piać hadoŭ. Ja saŭsim małady žaniŭsia.— Dyk woś ja ŭziaŭsia iznoŭ. Jašče try wiečary zubryŭ da poŭnačy tablicu i dwa razy jaje pierapisaŭ. Zatoje ciapier i sprasońnia skažu, što zachočacie. I kožnuju ličbu pamnožu — razdzialu, choć na što chočacie! Pryłamaŭsia, jak pastanawiŭ.

Dy mała taho, — kazaŭ dalej Kajetan,— ja staŭ pryhladacca ŭ knižki: baču,—i heta pa majej sile. Woś ja wiečarami staŭ wučycca pad rukoj syna. Pierš na śmiech, a pośle papraŭdzie. I nia śmiejciesia. Ja-ž byŭ dahetul saŭsim niahramatny, a ciapier ja čytaju i pišu. A i moj synok taksama pierastaŭ pieradamnoj kuražycca, bo nia moža adkazać na ŭsie maje pytańni. Tolki adnaho nie mahu paniać, na što my wučymsia papolsku, abo parasiejsku?

— A jak wučycca? — pytaŭ Symon.

— Panašamu! — kazaŭ Kajetan.

— Heta-ž paprostu! Ci-ž tak možna? — pytaŭ Tamaš.

— Čamu nia možna? — kazaŭ Kajetan.— Ja sam pryłamaŭsia i pračytaŭ knižku „Dudka Biełaruskaja." I widžu, što ŭłaśnie my pawinny wučycca paprostu. Čym praściej, tym lepš. A my saŭsim pakrywilisia i ničoha nia ŭmiejem. Tolki, jak durnyja, my stydajemsia sami siabie i swajho jazyka. Dyk wot jakoje dzieła! — Zatoje ja nia dziŭlusia, što i Hanulin chłapiec choča wučycca, a Hanula choča jaho addać u školu. I ja swajho małodšaha syna pašlu na druhi hod u Murawanku.

— Ale jak-ža ty, siastryca, paradziš u takuju nawuku? Hdzie ty woźmieš hrošy? — pytała Maryla.

— Ja nia wiedaju sama, — kazała Hanula.— Budu prasić pomačy. Jość ludzi, katoryja kryšku abiacajuć, kali chłapiec budzie zdolny i budzie staracca.

— A ci achwotu maje? — pytaŭ Kajetan.

— O, achwoty ŭ jaho, choć adbaŭlaj! Jeści nia budzie, spać nia budzie, aby tolki wučycca.

— Kali chłapiec budzie staracca, dyk i ja pamahu, — kazaŭ Symon, Hanulin brat. Ja sam kaliści hod wučyŭsia ŭ Nowaj Murawancy, ale zalaniŭsia i baćka zabraŭ mianie damoŭ, a ciapier užo nia wiernieš.

— I ja pamahu, čym zmahu,—kazaŭ Tamaš.

— A čym ty pamožaš? — pierabiła jaho Maryla. — U nas samych dzieci.

— Tolki ž adna Julačka, — hawaryŭ Tamaš.

— Adna to adna, a ŭsio jašče moža zdarycca. Što tut hawaryć...

— Nu, choć u Murawanku chłapca padwiazu, — adkazaŭ Tamaš naprociŭ žoncy.

— A ja dumaju, što ty, Hanula, tolki na śmiech siabie wystaŭlaješ,—hawaryŭ swajo dziadźka Matusewič. — Nie twajej heta siłaj. Z całaj našaj Zawałaki nichto ŭ Murawanku synoŭ nie pasyłaje, choć jość tut mnoha bahatych haspadaroŭ, a ty — biez hrašej, biaz chaty, biez swajho zahonu... Kudy-ž ty parywaješsia? Tolki daremna sarwieššia i prapadzieš za ništo!...

— Jak Boh daść, tak i budzie. Boh silniejšy za ludziej, — tak zakončyła radu Hanula.

— Užo lepš išła-by zamuž za taho arhanistaha, — kazaŭ jašče dziadźka. — Dyk i mieła-by za što syna wučyć.

— Kali Boh nia sudziŭ, — adkazała Hanula.

Tym rada i skončyłasia. Usie razyjšlisia.

— Kali ty sama pastanawiła, na što było nas klikać, — dumaŭ dziadźka, idučy damoŭ.

БЕЛАРУСКАЯ ХРОНІКА.

Два рэфэраты др. Я. Станкевіча. У мінулым тыдні др. Я. Станкевіч прачытаў у Вільні два беларускія рэфэраты: у пам. Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры 9 г. м. „Аб беларускім плямі Северанах" і ў Т-ве Беларусаведы 11 г.м. на тэму „Беларусіка на Зьездзе славянскіх філёлёгаў у 1934 г."

Сьвяткаваньне незалежнасьці Польшчы ў Віл. Бел. Гімназіі. У нядзелю 11 лістапада с. г. прыпадалі ўгодкі незалежнасьці Польшчы. У Вільні пачалі гэную ўрачыстасьць у суботу, 10 лістапада. Пачалі сьвяткаваньне ў суботу і ў Беларускай Гімназіі. Вучыцялі наладзілі адпаведную акадэмію. Загадалі вучням прыгатаваць і прачытаць на акадэміі рэфэраты. Перш выступаў вучыцель, які ўдэрыў ва ўсе званы польскага патрыятызму, без канца выказваючы польскае дабрадзейства для Беларусаў. Пасьля пачаліся рэфэраты вучнёўскія. Вучнёўскія рэфэраты супроць прамовы вучыцеля гучэлі хаўтурным звонам па беларускім школьніцтве, выказваючы дзе, колькі і якія беларускія школы закрыты польскімі ўладамі.

Паседжаньне Камісіі Помачы Бел. Студ. Моладзі адбылося 10 г. м. Пастаноўлена на ім: 1) выдаць адозву, якую друкуем у гэтым нумары „Б. Крыніцы", 2) вясьці кніжку сталых ахвярадаўцаў дапамогі беларускай незаможнай студ. моладзі, 3) адбываць дыжуры Камісіі ў чацьвяргі і пятніцы кожнага тыдня, паміж 9 і 12 гадзіне, у памешканьні на Завальнай вул. 1—3. Паседжаньні Камісіі будуць адбывацца штотыдзень у пятніцу а гадзіне 19 мін. 30.

У студэнскім Т-ве Беларусаведы пры УСБ у нядзелю дня 18.XI г. м. у салі IX галоўнага будынку УСБ адбудзецца чарговая зборка, з рэфэратам абс. М. Пяцюкевіча на тэму „Марксыцкія мэтоды у этнографічных досьледах ў СССР."

Пачатак а гадз. 17-й. Уступ для ўсіх вольны.

З дзейнасьці Б.С.С. У суботу 17.XI 34 адбудзецца ў Беларускім Студэнскім Саюзе, Завальная 1-1. Вечар прысьвячаны Цётцы (А. Пашкевіч-Кейрыс). Праграма прадбачыць: 1. Уступнае слова, 2. Рэфэрат, 3. Рэцытацыі твораў.

Пачатак пунктуальна а гадз. 19 з паловай.

Parachoŭnia ŭ Eŭropie.

Miž Francyjaj i Niamieččynaj znachodzicca niewialiki, ale pramysłowa bahaty kraj, h. zw. basejn Saary.

Na 1921 kw. kilom. žywie tam 800 tysiač amal wyklučna niamieckaha nasielnictwa. Bahaćcie henaha kraju tworać: kapalni wuhla, fabryki žaleza, ceramiki i šklanyja huty.

Paśla suświetnaj wajny Wersalskim dahaworam heny kraj adłučyli ad Niamieččyny i stwaryli z jaho asobny wokruh pad apiekaj Lihi Narodaŭ. Usie kapalni wuhla addany Francyi. Pa 15 hadoch u saarskim wokruzie maje adbycca plebiscyt (narodnaje hałasawańnie), jaki wyrašyć, da kaho heny kraj maje naležać: da Niamieččyny, da Francyi, ci maje astacca pa ciapierašniamu. Woś 15-cihadowy srok sioleta minaje i na 13 studzienia 1935 hodu naznačany heny plebiscyt.

Abiedźwie zacikaŭlenyja dziaržawy — Niamieččyna i Francyja—wiaduć silnuju ahitacyju siarod nasielnictwa Saary, kab wyjhrać kožnaj na swaju karyść hałasawańnie. Francyja mienš ad Niamieččyny spadziajecca wyjhryšu plebiscytu. Dziela hetaha šukaje jana začepki, kab na čas plebiscytu ŭpuścić u Saaru swajo wojska. Hetkuju začepku francuskija palityki ŭžo znajšli, — jany puskajuć čutki, što saarskija hitleroŭcy choćuć zrabić bunt i biez plebiscytu pryłučyć Saaru da Niamieččyny. Francuskija harnizony wojska stajać na saarskaj hranicy i čakajuć prykazu zaniać Saaru.

Kali-b francuskaje wojska zaniało Saaru, dyk chiba-ž Niamieččyna nie ściarpieła-b. Takim čynam moža ŭspychnuć henaja parachoŭnia.

Źmiena ŭradu ŭ Francyi.

Paśla wajny, asabliwa, kali haspadarčy kryzys štoraz silniej ściskaje ŭ swaich klaščoch narody i dziaržawy, zaznačajecca pastajanny ŭpadak značeńnia palityčnych partyjaŭ i ahraničwajucca prawy parlamantu na karyść wykanaŭčaj ułady.

Premjer francuskaha ŭradu Dumerg padaŭ prajekt źmieny konstytucyi, pawodle jakoha prezydent dziaržawy mieŭ-by prawa raźwiazać parlamant biaz zhody senatu. Suproć hetaha rezka wystupili socyjalisty, jakija byccam baroniačy demokracyju imknucca da dyktatury. U wyniku henaj baraćby ŭrad Dumerga padaŭsia ŭ adstaŭku. Paŭstaŭ nowy ŭrad, na čale z Flandinam.

Paśla hetaj uradawaj pierasartoŭki pačalisia wa ŭsiej Francyi palityčnyja zawarušeńni; pačalisia wuličnyja zmahańni fašystaŭ z socyjalistymi i kamunistymi. Pryčynaj hetaha jość toje, što premjer Flandin i inšyja ministry stajać tak-ža za źmienu konstytucyi.

Śmiarotny prysud na Ukraincaŭ.

U minułym tydni akružny sud u Lwowie sudziŭ 9 maładych ukraincaŭ, katorych winawaciŭ za prynaležnaść da OUN (Orhanizacyja Ukrainskich Nacyjanalistaŭ) i za zabojstwa ahienta palicyi (špika) Jacyny.

U wyniku rasprawy zasudžany: *Hryć Kułykiwć i Žinowij Matła— na karu śmierci,* Taras Hałapas na 12 hadoŭ, Wołodymyr Kasarab—11 hadoŭ, Lew Stojkewyč 10 hadoŭ, Iwan Mykytiuk—na 7 hadoŭ, Myron Bohun — na 7 hadoŭ, Semen Wasečka na 7 hadoŭ katarhi.

Da wiedama padpiščykaŭ „Bieł. Kryn."

Niekalka tydniaŭ tamu, pošta zawiała h. zw. „razrachunkowyja pierakazy."—Heta jość sinija blankiety, jakija možna dastawać na kožnaj pošcie pa 1 hrašu za štuku. Wyhodnyja jany tym, što pierasyłajučy hetym pierakazam hrošy za hazetu da 15 zł. ničoha nia płacicca za pierasyłku Dyk karystajcie z henaj paštowaj dahodnaści i prysyłajcie hetymi pierakazami zalehłaści za „B. Krynicu."

Adras na razrachunkowych pierakazach treba pisać hetki: Redakcyja i Administracyja „Biełaruskaja Krynica", Wilno, ul. Zawalna 1—1. Nr. kartoteki 21.

Wydawiectwa „Bieł. Krynicy" pry nastupnych numaroch našaj časopisi budzie rassyłać hetkija blankiety— razrachunkowyja pierakazy—i adumysłowyja atkrytki, jakimi treba abnaŭlać padpisku na 1935 h. i wypisywać našu hazetu.

RED. I ADM. „BIEŁ. KRYNICY."

Pieramoha demokrataŭ u Amerycy.

Apošnimi časami adbylisia parlamanskija wybary ŭ Zł. Št. Ameryki, u jakich wializarnaj bolšaściaj pieramahli demokraty. Amerykanskija palityki na padstawie hetych wybaraŭ ćwierdziać, što ciapierašni prezydent Ruswelt u 1936 hodzie budzie wybrany panoŭna. Prezydent Ruswelt prawodzić u Zł. Št. Ameryki wialikija reformy ŭ nutranym žyćci.

Roznyja wiestki.

Z POLŠČY.

Paśla spynieńnia sojmawaj sesii. Sioletniaja biudžetnaja sesija polskaha Sojmu radziła tolki adzin dzień i adłožana na 30 dzion. Heny adzin dzień sojmawych naradaŭ byŭ dawoli burliwy i šmat čaho wydabyŭ na pawierchniu. Heta ŭsio skwapna padchapiła presa i wiestki henyja ŭžo stalisia publična wiedamyja. Wyhladajuć jany hetak:

U dyskusii pasoł Rybarski (endecyja) haworačy ab koncentracyjnych łahierach u Berezie Kartuskaj miž inšym skazaŭ, što ŭzrost represijaŭ suproć endekaŭ treba pajaśniać žydoŭskimi ŭpływami.

Pasoł Miedzinski (BB.) adkazwajučy pasłom z apazycyi miž inšym pračytaŭ nielehalnuju hazetu „Štafeta," dzie skazana, što ciapierašni ŭrad nia jość polskim uradam, ale ŭradam zapradažnikaŭ i što šwagier Litwinawa (kamisara SSRR.) jość ministram nutranych spraŭ u Polščy i h. d.

Endecki klub padaŭ interpelacyju da staršyni rady ministraŭ u sprawie padziejaŭ u Berezie Kartuskaj. U interpelacyi miž inšym skazana hetak: „Z asobami pasadžanymi ŭ miejscy adasabnieńnia ŭ Berezie Kartuskaj pastupali tasujučy moralnyja ździeki"...

„Jak pažywu dawali aryštawanym u łahiery miž inšym: niedapiečany chleb, čarwiwy haroch, čarwiwuju słaninu... Nie pazwalali atrymliwać pasyłak z pažywaj"...

„Aryštawanych zmušali da ciažkoj pracy... apračа hetaha jany musili wykonywać najbolš prykryja čynnaści, bo kazali im paradkawać „ubikacyi" i myć hołymi rukami splujnicy nia tolki swaje, ale i tyja, kudy pławali palicejskija."

„Bili wiaźniaŭ pry kožnaj nahodzie: bili na kalidorach, bili pry pracy"...

Interpelanty pytajucca, ci henyja ździeki byli wykanańniem zahadu ŭradu.

Biezraboćcie. Ciapier biezrabotnych u Polščy naličwajecca 302 326 asob. Za apošni tydzień prybyło biezrabotnych 5.525 asob. Heta biezrabotnyja, što zapisanyja. A kolki ž jość niezapisanych?!

Aryšty siarod moładzi ŭ Waršawie. U min. tydni wykryli nielehalnuju dziejnaść „obozu narodowo radykalnaho" (polskija nacyjanalisty) ŭ Waršawie i ŭ źwiazku z hetym niekalka asob aryštawana.

Z ZAHRANICY.

Monarchistyčny komunizm. U Japonii šyraka prapahujecca, hałoŭna siarod intelihiencyi, ideja hetak zwanaha monarchistyčnaha komunizmu, prahrama jakoha mienš-bolš pradstaŭlajecca hetak: 1) kasujecca parlamant, bo jon jość arenaj baraćby za ŭładu; 2) zawodzicca dyktatura pawodle ŭschodnich paniaćciaŭ, h. zn. despotyzm; 3) car-mikada astajecca i nadalej haławoj dziaržawy i narodu; 4) prawa hołasu wa ŭsich sprawach hramadzkaha značeńnia maje tolki haspadar siamji; 5) prywatnaja ŭłasnaść ahraničwajecca ŭ taki sposab, što ŭsie dwary, daražejšyja jak 1 milјon jen, pierachodziać na karyść dziaržawy. Usie pramysłowyja i handlowyja pradpryjemstwy z kapitałam bolš 10 milijonaŭ jen tak-ža pierachodziać na karyść dziaržawy; 6) krytyka palityki i ŭradu zabaraniajecca, a ŭsialakaja apazycyja karajecca.

Jak bačym, dyk henaja ideja japonskaha komunizmu mała roźnicca ad komunizmu rasiejskaha. Adnak balšawiki hledziačy na henuju prajawu ŭ Japonii na ŭwieś świet kryčać ab niebiaśpiecy ad hetaha Sawietam.

Balšawiki nia mohuć zwajawać relihii. U suwiezi z hadaŭščynaj balšawickaj rewalucyi 7 h. m. sawieckija hazety padličajuć swaju dziejnaść miž inšym i na biazbožnickim froncie. Orhan wajujučaha sawieckaha ateizmu „Biazbožnik" pryznajecca, što biazbožnickaja akcyja dała adwarotny rezultat: — „relihija trymajecca dalej ŭ świedamaści rabotnickich mas; jašče mnoha jość rabotnikaŭ, što wierać u Boha; relihijnaje žyćcio jašče astajecca ŭ wializarnaj čaści nasielnictwa; u časie świataŭ rabotniki nia wychodziać na rabotu."

„Za zdradu baćkaŭščyny". Balšawiki adraklisia ŭžo ad suświetnaj rewalucyi i pryznali swajej baćkaŭščynaj SSRR. Ciapier i prysudy matywujuć „za zdradu baćkaŭščyny." Dwa miesiacy tamu ŭ Gdyni źlez z sawieckaha karabla matros Waronkow i admowiŭsia na karabiel wiartacca astaŭšysia ŭ Polščy. Sawiecki sud zasudziŭ jaho zawočna „za zdradu baćkaŭščyny" na karu śmierci i zahadaŭ aryštawać jaho swajakoŭ.

Niaŭdača kamunistaŭ u Kitaju. U kitajskaj prawincyi Kieng-Sin praz 6 hadoŭ panawaŭ komunizm. Ciapier armija kitajskaha maršała Čeng-Kaj-Šeka zaniała henuju prawincyju, a kamunisty raźbiehlisia chto kudy.

Z KRAJU

Napad na poštu. Nadowiečy kala Dzisny napali bandyty na paštalijona, jaki wioz poštu. Bandyty byli ŭžo zaŭładaŭšy kaniom i poštaj, ale chutka ad ich poštu i kania adabrali.

Uciakajuć z Sawietaŭ. Na sawiecka-polskaj hranicy, kala Suchadoŭščyny, zatrymali polskija ŭłady hrupu maładych chłapcoŭ, jakija ŭciakli z Sawietaŭ.

Z WILNI.

Няпрыемныя імяніны. Р. Астроўскі, галава бел. санацыі, дыр. бел. філіі Славацкага гімназіі ў Вільні, у мінулым тыдні спраўляў імяніны. Усё йшло як па масьле. Аж далоліха— паявіліся ў інтэрнаце і гімназіі ўлёткі проціў самага-ж Астроўскага, прыпамінаючы яму ягоную „высока пэдагогічную" дзейнасьць.

Дык пытаем, калі-ж гэта ўсё скончыцца? Думаем, што тады, калі Астроўскі пакіне гімназію.

Разам судзяцца і разам спачуваюць. „Kur. Wil." № 306 піша, што на рукі галоўнага яго рэдактара, з прычыны сьмерці польскага дзеяча М. Сьвехоўскага, выразілі свой спогад А. Луцкевіч і Р. Астроўскі. Цікава, што гэтыя стаўпы бел. польскай угоды ўжо аддаўна між сабой грызуцца за карыта на так зв. грамадзкім судзе, а вось спагадаюць дык разам. Ясна спагадаць можна, але чаму праз „Kur. Wil."? Відаць, яны ведаюць, што робяць.

Biezraboćcie. U Wilni ciapier jość zarejestrawanych biezrabotnych 6137 asob. Biezraboćcie pačało ŭznoŭ uzrastać.

Centralny Urad Bieł. Instytutu H. i Kult. pawiedamlaje ŭsich siabroŭ, što jość NOWYJA ZNAČKI INSTYTUTU ŭ canie 50 hr. za štuku z pierasyłkaj pry bolšaj kolkaści. Wypiswajučy znački, treba prysyłać hrošy ŭ Centralu Instytutu (Zawalnaja 1), pawiedamlajučy adnačasna, skolki značkoŭ wysłać mužčynskich a skolki žanočych (žanočyja z špilkaj, jak broška).

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1— 3. Wy dawiec A Šutowi